www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 9 лютага 2006 года, № 3 (1933)

ВІНШУЕМ!

## УШАНАВАННЕ НАВУКОЎЦАЎ

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 31 студзеня па традыцыі ўручыў дыпломы дактароў навук і атэстаты прафесараў навуковым і навукова-педагагічным работнікам краіны. Ад БДУ на гэтую цырымонію былі запрошаны 7 навукоўцаў.***

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі навука запатрабавана: "Мы аб'явілі прыярытэтам і рэалізуем на справе інавацыйны шлях развіцця. Тым самым пашырылі сферы прыкладання сіл айчынных вучоных, стварылі ім новыя магчымасці для творчага і прафесійнага росту".

На цырымоніі словы ўдзячнасці прэзідэнту за падтрымку сістэмы адукацыі адрасаваў першы прарэктар БДУ доктар хімічных навук, прафесар Сяргей Рахманаў. Ён выказаў упэўненасць, што менавіта клопат дзяржавы садзейнічаў захаванню ў Беларусі моцных школ матэматыкі, фізікі, біялогіі, іншых навук. А збалансаваная палітыка з боку кіраўніцтва краіны стала залогам трыумфальных перамог беларускіх ліцэістаў і студэнтаў на прэстыжных міжнародных алімпіядах.

**Паводле інфармацыі БЕЛТА**

АФІЦЫЙНА

## АДБУДЗЕЦЦА ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА

**10 лютага ў 10.15 у будынку рэктарата пройдзе пасяджэнне Вучонага савета БДУ. З асноўным дакладам "Вынікі навукова-даследчай работы БДУ за 2005 год" выступіць першы прарэктар, прафесар Сяргей Кімавіч РАХМАНАЎ.**

СПОРТ

## МОДА НА ЗДАРОЎЕ



Рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў 5 лютага ўзнагародзіў пераможцаў Спартакіяды здароўя. Цырымонія адбылася ў САК "Брыганціна" падчас "Дзён здароўя". Прызавыя месцы дасталіся агульнауніверсітэцкай кафедры фізвыхавання і спорту, факультэту радыёфізікі і электронікі, а таксама фізічнаму факультэту.

У спаборніцтвах удзельнічалі 19 камандаў розных структурных падраздзяленняў нашага універсітэта, якія сабралі разам каля 500 чалавек. Спаборніцтвы адбываліся па баскетболе, валейболе, міні-футболе, шахматах, настольным тэнісе, плаванні, армрэстлінгу.

У межах "Дзён здароўя", арганізаваных пры фінансавай падтрымцы прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў БДУ, адбыліся спаборніцтвы па перацягванні каната, плаванні, а таксама спаборніцтвы па лыжах.

**Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## КУБАК ЗА АБАРОНУ

***Упершыню за ўвесь час існавання нашага універсітэта работа па грамадзянскай абароне БДУ прызнана самай лепшай сярод прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, а таксама ВНУ Маскоўскага раёна сталіцы.***



За плённую працу, выяўленую ініцыятыву і творчы падыход, а таксама ўмелае кіраўніцтва і значны ўнёсак у арганізацыю функцыянавання грамадзянскай абароны яе начальнік, рэктар нашага універсітэта В.І. Стражаў быў узнагароджаны пераходным кубкам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. За мінулы год штабам грамадзянскай абароны адрамантаваныя 2 сховішчы, у адным з іх створаны навучальны клас, які пазней абсталявалі камп'ютарнай тэхнікай, тэлевізарам і відэамагнітафонам для паказу навучальных фільмаў. За час існавання гэтага класа з 1 лістапада 2005 г. ужо прайшлі навучанне каля 500 супрацоўнікаў, студэнтаў і навучэнцаў. У красавіку 2005 г. адбыліся вучэнні па разгортванні зборна-эвакуацыйнага пункта і пункта выдачы сродкаў індывідуальнай засцярогі. Для наладжвання больш якаснага навучальнага працэсу ва ўнутранай сетцы БДУ (Intranet.bsu) штаб грамадзянскай абароны размясціў тэматычную праграму 2006 г. з неабходнымі матэрыяламі.

Дасягнутыя поспехі з'явіліся вынікам калектыўнай працы адміністрацыі БДУ, штаба грамадзянскай абароны, многіх кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, начальнікаў спецслужбаў грамадзянскай абароны, камандзіраў неваенізаваных фарміраванняў. Асаблівая якасна была арганізавана праца па грамадзянскай абароне на фізічным, біялагічным, геаграфічным, хімічным і ваенным факультэтах. Варта адзначыць таксама службу ахоўы і бяспекі, вучэбна-спартыўны комплекс "Буравеснік", студэнцкі гарадок, другі аддзел.

У цяперашні час штаб грамадзянскай абароны часова размешчаны на юрыдычным факультэце (вул. Ленінградская, 8, пакой 219, тэл. 209-55-20).

**Ірына ШЫК**

**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

## У МАСКВУ ПА МЕДАЛІ

***Больш за 70 распрацовак прывёз БДУ на VI Маскоўскі міжнародны салон інавацый і інвестыцый, які адбываецца ў расійскай сталіцы 7—10 лютага.***

16 апошніх навукова-тэхнічных навінак БДУ заяўленыя для ўдзелу ў конкурсе інавацыйных праектаў, вынаходстваў і распрацовак. Найбольш перспектыўныя міжнароднае журы адзначыць Гран-пры, медалямі і дыпломамі аргкамітэта салона, узнагародамі і спецыяльнымі прызамі расійскіх і міжнародных арганізацый.

Экспазіцыя БДУ ўключае распрацоўкі па медыцыне і ахове здароўя, прамысловым абсталяванні, экалагічнай бяспецы і абароне навакольнага асяроддзя, сельскай гаспадарцы і харчовай прамысловасці, інфармацыйных тэхналогіях, аналітычных і кантрольна-вымяральных сістэмах і прыладах, хімічнай прамысловасці, бяспецы жыццядзейнасці чалавека.

Маскоўскі міжнародны салон інавацый і інвестыцый — найбуйнейшае ў Расіі навукова-тэхнічнае выстаўнае мерапрыемства. Летась, напрыклад, у мерапрыемствах салона прынялі ўдзел прадстаўнікі больш за 400 арганізацый і прадпрыемстваў з 56 рэгіёнаў Расіі, Сусветнай арганізацыі па ахове інтэлектуальнай уласнасці, дэлегацыі з Украіны, Беларусі, Кіргізіі, Балгарыі, Польшчы, Румыніі, Эстоніі, Канады, Бельгіі, Кітая, Італіі, Паўднёвай Карэі, Францыі і іншых краін свету.

Беларускі дзяржаўны універсітэт прымае ўдзел у салоне ў чацвёрты раз. Летась на V Маскоўскім міжнародным салоне інавацый і інвестыцый праз прадукцыя нашага універсітэта атрымала 2 залатыя, 7 срэбраных, 3 бронзавыя медалі і 1 дыплом.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:
НОВАЯ КАЦЕЛЬНЯ — НОВАЕ ЖЫЦЦЁ «БРЫГАНЦІНЫ»
Інтэрв'ю з дырэктарам САК "Брыганціна" Уладзімірам ПАЛЯКОВЫМ
Стар. 2

БДУ ПАЧЫНАЎСЯ З РАБФАКА
Успаміны былой студэнткі А. Борун
Стар. 3

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Зацверджана мастацкая канцэпцыя экспазіцыі Музея гісторыі БДУ. Аўтарамі яе па выніках тэндэра абраны мастакі Леанід Гоманаў і Сяргей Саркісаў. Адкрыецца музей сёлета ў кастрычніку да 85-х угодкаў БДУ.

Дасягнута дамоўленасць з "Мінэнерга" пра стварэнне сумеснай вытворчасці вырабаў з пенаполіурэтану для мэтаў энергазберажэння. Пра гэта паведаміў на пасяджэнні рэктарата першы прарэктар Сяргей Рахманаў. Паводле яго словаў, адбыліся таксама перамовы з некаторымі прадпрыемствамі наконт павелічэння аб'ёму вытворчасці натуральных харчовых дабавак для хлебабулачных вырабаў.

Будаўніцтва новага інтэрната на тысячу месцаў мяркуецца ажыццявіць у 2007 г. Будынак з'явіцца на праспекце Дзяржынскага побач з медыцынскім універсітэтам.

АКТУАЛЬНА

## ШКОЛА ДЛЯ РЭДАКТАРАЎ

Семінар-практыкум «Зімовая школа студэнцкай журналістыкі» адбудзецца з 17 па 19 лютага на базе САК «Брыганціна». Удзельнікамі яго стануць рэдакцыйныя калегіі студэнцкіх малатыражных газет ВНУ. У праграме семінара работа 4 секцый, круглы стол, спартыўныя спаборніцтвы, правядзенне выставы-конкурсу газет, конкурсу на сценнага плаката «За моцную і квітнеючую Беларусь!». Удзел у семінары возьмуць прадстаўнікі Савета Міністраў, Міністэрства адукацыі, Мінгарвыканкама, кіраўніцтва БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# НОВАЯ КАЦЕЛЬНЯ — НОВАЕ ЖЫЦЦЁ “БРЫГАНЦІНЫ”



***Спартыўна-аздараўленчы комплекс “Брыганціна”, размешчаны ў Радашковічах, трэці год гасцінна прымае ў сваіх сценах студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ. Разам з тым увесь гэты час, асабліва ў зімовы перыяд, існавалі пэўныя цяжкасці з забеспячэннем нармальнага тэмпературнага рэжыму ў будынках. Сёлетнія маразы яшчэ раз пацвердзілі, што адной з самых актуальных праблем “Брыганціны” з’яўляецца будаўніцтва ўласнай кацельні. І яно ўжо вядзецца ў рамках рэканструкцыі ўсяго комплексу. Падрабязней пра гэта нашай газеце распавёў дырэктар “Брыганціны” Уладзімір Аляксандравіч ПАЛЯКОЎ:***

— Будаўніцтва ўласнай кацельні — неабходны крок і наша першачарговая задача. На сённяшні дзень “Брыганціна” ацяпляецца ў цэнтралізаванай кацельні, якая знаходзіцца ад нас за кіламетр і паралельна абслугоўвае яшчэ некалькі суседніх санаторыяў: “Сасновы бор”, “Зорны”, “Волат” і “Барок”. Працуе яна кепска, бо і сама ўжо ў вельмі дрэнным стане. Мяркуйце самі: напрыклад, 24—30 студзеня ў самым цёплым пакоі тэмпература паветра была толькі 13 градусаў, што і стала прычынай для адмены ў гэтыя дні заезду студэнтаў у “Брыганціну”. Што ж гэта за адпачынак, калі ў памяшканні так холадна?

Над праектам кацельні мы пачалі працаваць яшчэ ў 2004 г., бо падрыхтоўка, у тым ліку распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі, выбар пляцоўкі пад будучы аб’ект — дастаткова працаёмкі працэс. Выраб абсталявання пачалі ў сакавіку 2004-га, а фактычную будоўлю — у 2005 г. Плануем, што ў маі-чэрвені бягучага года кацельня будзе здадзена ў эксплуатацыю.

**— Будаўніцтва кацельні і інфраструктуры комплексу абыдзецца, паводле словаў рэктара, амаль у 1 млн долараў. Ці не танней і эканомней рэканструяваць старую кацельню?**

— Рэанімаваць і аднаўляць старую кацельню намаганнямі універсітэта няма сэнсу. Навошта ўкладваць свае грошы ў чужую гаспадарку? Будучая кацельня — цалкам аўтаномная і самастойная. Яна будзе абслугоўваць толькі наш комплекс. Але мы згодны таксама і на супрацоўніцтва: напрыклад, у летні перыяд, калі кацельня патрэбна толькі для нагрэву вады, мы можам прадаваць лішкі цяпла суседняму санаторыю “Сасновы бор”. Гэта заўсёды запатрабавана.

Будаўніцтва кацельні — дарагі праект. Адно толькі абсталяванне абышлося універсітэту ў 530 млн руб. Затое набылі толькі сучасную найноўшую тэхніку.

Сёння ў нашай краіне заўважаецца тэндэнцыя будаваць кацельні і электрастанцыі на мясцовых відах паліва. Наша кацельня, напрыклад, будзе працаваць на драўняных адыходах. Гэта зручна і выгадна.

Абсталяванне для кацельні закуплена на сумесным французска-беларускім прадпрыемстве і хутка будзе перавезена ў “Брыганціну”.

**— Якіх зменаў яшчэ вымагае комплекс?**

— Другім прыярытэтам рэканструкцыі САК “Брыганціна” з’яўляецца рамонт даху абодвух блокаў (першы блок — гэта сталовая на 460 месцаў і канцэртная зала на 429 месцаў, другі блок — спорткомплекс: басейн на 25 метраў і спартыўная зала). Гэта таксама дастаткова дарагі праект: ён абыдзецца нам у 700 млн рублёў. Дорага, але неабходна. Два ж карпусы, што функцыянуюць сёння, капітальнага рамонту не патрабуюць. Мы плануем толькі змяніць дах, уцяпліць будынкі, зрабіць сучасны рамонт. Хочацца, каб было сапраўды камфортна і ўтульна.

Таксама распрацоўваем праект рэканструкцыі першага спальнага корпуса. Ён не выкарыстоўваецца ўжо на працягу 8 гадоў, бо там няма ні электрычнасці, ні гарачай вады, ні ацяплення. Будынак паступова разбураецца. Плануем адрамантаваць яго, зрабіць з чатырохмесных пакояў двух-, трохмесныя нумары. Да гэтага корпуса мяркуецца падключыць лячэбную базу і зрабіць сапраўдны санаторый, які будзе працаваць на працягу ўсяго года для супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта і, спадзяюся, усёй вышэйшай школы краіны.

**— Як Вы лічыце, ці апраўдаюцца затраты на рэканструкцыю комплексу?**

— Патрэбна яшчэ каля 2 гадоў, каб увасобіць усе нашы планы. Будаўніцтва кацельні — першы і галоўны крок у гэтым кірунку. Наш санаторна-аздараўленчы комплекс толькі трэці год з’яўляецца структурным падраздзяленнем БДУ, але ён ужо добра знаёмы ўсяму калектыву універсітэта, і колькасць жадаючых адпачыць тут толькі павялічваецца. Я ўпэўнены: як мы ўмеем адпачываць — так умеем і працаваць. Добра адпачываем — добра працуем. “Брыганціна” — гэта цудоўная магчымасць адпачыць і паправіць здароўе. Сёння комплекс прымае каля 250 чалавек за адну змену. Пасля рэканструкцыі колькасць месцаў крыху зменшыцца, але якасць аздараўлення і адпачынку заўважна палепшыцца. Напэўна, павялічыцца колькасць дзён змены: курс комплексных працэдур складзе прыкладна 18—20 дзён.

Калі мы давядзем да лагічнага завяршэння рэканструкцыю спальнага корпуса і лячэбнай базы, у нас атрымаецца паўнацэнны санаторый для студэнтаў, аспірантаў і супрацоўнікаў універсітэта. Тады ўсе выдаткі на яго рэканструкцыю будуць стопрацэнтна апраўданыя.

**— Якой Вам бачыцца ідэальная “Брыганціна”?**

— Хочацца многа зрабіць на тэрыторыі нашага комплексу. Тэрыторыя “Брыганціны” — 14 гектараў! Мы мяркуем пашырыць спартыўную базу, заказаць праект на выраб адкрытых тэнісных кортаў. У нас ужо ёсць футбольныя і міні-футбольныя палі, валейбольныя і баскетбольныя пляцоўкі, палі для гарадкоў. А тэнісных кортаў няма, хоць плошча дазваляе. Трэба выпраўляць! Таксама хочацца паставіць на паветры сталы для пінг-понга, разбіць пляцоўкі для гульні ў бадмінтон... Мараў і планаў так многа, што хопіць для некалькіх комплексаў!

“Брыганціна” — спартыўна-аздараўленчы комплекс, які павінен апраўдваць сваё прызначэнне. Усё для спорту, для здароўя, для людзей!

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

АКТУАЛЬНА

# БУДЗЕМ ПІЛЬНЫМІ!



Пасяджэнне камісіі па прафілактыцы правапарушэнняў і п’янства БДУ, якую ўзначальвае прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У. Сувораў, адбылося 2 лютага. У мерапрыемстве прынялі ўдзел пракурор Маскоўскага раёна В. Жынгель, намеснік начальніка ўпраўлення выхаваўчай работы Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама А. Стрыгельскі, намеснік начальніка Маскоўскага РУУС, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі і спецыяльнай міліцыі В. Сінякоў, намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі і спецыяльнай міліцыі Маскоўскага раёна В. Лізун, начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю БДУ П. Скалабан.

Дзеля прафілактыкі злачынстваў камісія рэкамендавала размясціць на стэндах у адміністрацыйных будынках і інтэрнатах інфармацыйныя матэрыялы, арганізаваць сустрэчы з прадстаўнікамі міліцыі і пракуратуры са студэнтамі і супрацоўнікамі па пытаннях ўважлівага і ашчаднага стаўлення да ўласнай маёмасці. Мяркуецца таксама зрабіць больш пільным прапускны рэжым у навучальныя карпусы.

**Святлана ДАЛГАНЮК**
**Фота аўтара**

### Даведка

За 2005 г. і студзень 2006 г. на тэрыторыі БДУ адбылося 20 крадзяжоў, пры гэтым толькі за 18 дзён бягучага года было здзейснена 5 крадзяжоў. Найчасцей кралі мабільныя тэлефоны, кашалькі з грашыма і дакументамі, іншую асабістую маёмасць студэнтаў і супрацоўнікаў.

Як правіла, ахвярамі становяцца тыя, хто сам праяўляе нядбайнасць: пакідае асабістыя рэчы ў сталовых, чытальных залах і іншых месцах грамадскага карыстання.

За 2005 г. студэнты БДУ здзейснілі 6 крымінальных і 33 адміністрацыйныя правапарушэнні. Найбольш частыя — парушэнне Правілаў дарожнага руху, у тым ліку кіраванне транспартам у нецвярозым стане.

Згодна з дзеючымі ў БДУ правіламі, за адміністрацыйнае ці крымінальнае правапарушэнне навучэнец можа быць адлічаны з універсітэта на падставе рашэння камісіі па прафілактыцы правапарушэнняў і п’янства БДУ.

КАНТАКТЫ

# МОЛАДЗЬ СУПРАЦЬ ТЭРАРЫЗМУ

***У студзені 2006 г. каманда студэнтаў факультэта філасофіі і сацыяльных навук нашага універсітэта прыняла ўдзел у міжнародным студэнцкім семінары ў Фларэнцыі.***

Выступ беларусаў пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры філасофіі культуры Іны Міхайлаўны Налівайка выклікаў вялікую цікавасць як італьянцаў, так і прадстаўнікоў Усходняй Еўропы.

У склад каманды ўваходзілі Ганна Шасціта, Наталля Бядрыцкая, Іван Карпенка, Вольга Слізанава, Дзмітрый Куніцкі і Уладзімір Нічыпаровіч.

Мерапрыемства ладзілася пад эгідай Фонду Рамуальда дэль Б’янка дзеля рэалізацыі Праграмы міжнароднай інтэграцыі. У ім удзельнічалі, апроч беларускай, каманды з Украіны, Літвы, Чэхіі, Польшчы.

Семінар меў назву “Міжнародны маладзёжны турызм у эпоху глабальнага тэрарызму: 500 дзён пасля трагедыі ў Беслане”. Дзейнасць у рамках праграмы была падзеленая на тры этапы і ўключала працу ў дзвюх камандах — нацыянальнай і міжнароднай. На першым этапе нацыянальная каманда рыхтавала праект і размяшчала яго на сайце Фонду. Прэзентацыя гэтага праекта адбывалася ў першы дзень. А ўвечары была арганізавана “Global Village Party”, на якой кожная каманда паказвала сваю культуру: дзяўчаты і юнакі ў нацыянальных касцюмах частавалі прысутных стравамі нацыянальнай кухні.

Другі этап семінара адбыўся ў інтэрнацыянальных групах, дзе трэба было распрацаваць яшчэ адзін фундаментальны праект.

Трэці этап запланаваны на будучыню. Яго сэнс — у падрыхтоўцы выніковага інтэгральнага праекта, які грунтаваўся б на асэнсаванні праблемаў турызму і тэрарызму ў рамках нацыянальных камандаў і ўлічваў бы змястоўны досвед распрацоўкі праектаў у міжнародных студэнцкіх групаў.

Мэта дзейнасці Фонду Рамуальда дэль Б’янка — арганізацыя ў Фларэнцыі сустрэчаў і разнастайных мерапрыемстваў міжнароднага ўзроўню, дзе моладзь з розных краінаў атрымлівае магчымасць знаёміцца адзін з адным, развіваць і ўмацоўваць сяброўства і супрацоўніцтва.

**Наталля БЯДРЫЦКАЯ,**
**Дзмітрый КУНІЦКІ**

З ГІСТОРЫІ БДУ

# БДУ пачынаўся з рабфака

***Напярэдадні святкавання 85-годдзя Белдзяржуніверсітэта мы звяртаемся да гісторыі першых факультэтаў нашай alma mater.***

Згодна з пастановай Прэзідыума ЦВК БССР ад 18 красавіка 1921 г. Беларускі дзяржаўны універсітэт адкрываўся ў складзе трох факультэтаў — рабочага, грамадскіх навук і медыцынскага.

Ці ведаеце вы, што такое рабфак? У гэтых агульнаадукацыйных навучальных установах, якія ствараліся ў першыя гады савецкай улады, рабочых і сялян рыхтавалі да паступлення ў ВНУ. Сюды ішлі хлопцы і дзяўчаты з 16 гадоў па рэкамендацыях або камандзіроўках ад прадпрыемстваў, прафсаюзаў, камсамольскіх арганізацый. Вучыліся на рабфаку на працягу трох (дзённае аддзяленне) альбо чатырох гадоў (на вечаровым аддзяленні).

Рабочы факультэт БДУ быў першым у БССР. Заняткі на ім пачаліся 1 чэрвеня (на ўсіх астатніх факультэтах БДУ — пасля 30 кастрычніка). Спярша было 160 студэнтаў, але пазней іх лік вырас яшчэ на 125 чалавек. Кіраваў факультэтам прэзідыум з трох чалавек — загадчыка, яго намесніка і прадстаўніка студэнцтва. Выкладчыкаў было 26.



Якуб Колас і Змітрок Бядуля сярод студэнтаў рабфака БДУ. 1922 г.

У музеі гісторыі БДУ захоўваюцца ўспаміны былой студэнткі рабфака А. Борун. Вось што апавядае яна:

"Пасля трох гадоў палітыка-асветнай работы ў камсамоле... я атрымала ў лістападзе 1922 года накіраванне на вучобу...

БДУ — Беларускі дзяржаўны універсітэт! Рабочы факультэт! Кожнае слова як удар гучнага звона. Цуд здзейсніўся. Мяне залічылі студэнткай, праўда, не ў вышэйшую навучальную ўстанову, а на другі курс рабфака, але хто мог разлічваць на большае. У мяне ж адукацыя ніжэйшая... На пачатку навучання на 2-м курсе рабфака БДУ я жыла ў пакоі свайго чацвёртага брата, які вярнуўся з палону ўжо ў Савецкую Расію, вельмі хворага пасля работы ў палоне на цукроўні і атрыманай траўмы. На рабфак я хадзіла ў яго салдацкіх ботах і ў яго цёплым кажуху. У класах было вельмі халодна. Ногі ў ботах мерзлі. Скінуўшы боты, забіралася на парту з нагамі і прыкрывала іх крысом кажуха. Адзін толькі нос тырчаў з каўняра...

У Мінску правучылася год. Вяла камсамольскую работу агітатара і рэдактара сцянноўкі "Што ў Германіі". Дзень пры дні мы з вялікім хваляваннем сачылі за развіццём рэвалюцыйных падзеяў у Германіі, асвятлялі іх у сваёй сцянноўцы. Змяшчалі ў ёй не толькі газетныя і часопісныя матэрыялы, а шмат іншага матэрыялу... Наша 4-я пад'ячэйка КСМБ рабфака вяла агітацыйную работу на факультэце... Я паспявала ўдзельнічаць у даволі вялікім хоры і драмгуртку пры універсітэце. Гурток наважваўся ставіць урыўкі з п'есаў Шэкспіра. Маім таленавітым партнёрам быў студэнт нашай групы "вечна юны" Цукерберг, якога мы так назвалі за тое, што ён цягаўся за намі, маладымі. Тады як яму было гадоў 25. Потым гэты таварыш знайшоўся ў трупе Меерхольда ў Маскве.

Стыпендыя нашая была два рублі ў месяц. А падпрацоўваць на чыгунцы на разгрузцы вагонаў удавалася не часта. Больш мы працавалі на суботніках..."

Хоць БДУ ў першыя гады свайго існавання сутыкаўся з цяжкасцямі, гэта не стрымлівала абітурыентаў, якія ў ліпеньскую спёку, босыя, стомленыя, за 25—30 вёрст хадзілі па 3—4 разы ў райвыканкам, каб засведчыць анкету для паступлення ў ВНУ.

**Матэрыял падрыхтавала А.А. ПІШЧАЛЬНІКАВА, загадчык музея гісторыі БДУ**

# БДУ ў СМІ Беларусі




Шырока асвятлялася ў рэспубліканскіх СМІ перамога ліцэістаў БДУ на міжнароднай Жаўтыкоўскай алімпіядзе па матэматыцы і фізіцы ў Алма-Аце. Паведамленні пра гэта выходзілі пад такімі гучнымі загалоўкамі:

**"ЗОЛОТЫЕ НАШИ МАТЕМАТИКИ"** ("7 дней", 02.02.06);

**"БЛІСКУЧЫ ДЭБЮТ"** ("Звязда", 27.01.06);

**"ДЕРЖИМ МАРКУ"** ("Знамя юности", 27.01.06).

Асобныя сюжэты прысвяцілі перамозе ліцэістаў Беларускае тэлебачанне і радыё.

**"ЗОРНЫ" ТВАР ЖАНОЧАГА ФУТБОЛА"** — так назвала свой артыкул журналістка "Настаўніцкай газеты" (02.02.06) Наталля Алёхіна, якая падрабязна расказала пра жаночую футбольную каманду "Зорка БДУ". Нашы дзяўчаты, як вядома, сталі сярэбранымі прызёрамі чэмпіяната краіны ў мінулым годзе. У артыкуле закранаюцца таксама праблемы развіцця жаночага футбола і студэнцкіх спартыўных клубаў і камандаў. Сваімі думкамі на гэты конт дзяліцца кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па футболе БДУ Уладзімір Пігулеўскі, а таксама ўдзельніцы каманды БДУ і трэнеры.

У "Настаўніцкай газеце" (24.01.06) змешчаны артыкул дэкана філалагічнага факультэта БДУ Івана Роўды **"НАМ ЗДАВАЛАСЯ, ШТО МЫ ВЕДАЛІ ПРА ЯГО ЎСЁ..."**, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння доктара філалагічных навук прафесара Паўла Шубы.

**"ЗАСЯЛІЦЦА Ў ІНТЭРНАТ ЗА ЛІЧАНЫЯ ХВІЛІНЫ"** — назва артыкула ў "Настаўніцкай газеце" (31.01.06), у якім дырэктар студгарадка БДУ Міхаіл Чарапеннікаў расказвае пра дзейнасць у студгарадку прынцыпу "аднаго акна".

У газеце "Минский курьер" (31.01.06) надрукаваны вялікі матэрыял **"У ОДАРЕННЫХ ДЕТЕЙ ТАЛАНТЛИВЫЕ УЧИТЕЛЯ"** пра Генадзя Кеброўскага. 50 год працаваў ён на кафедры агульнай фізікі фізфака БДУ, а цяпер разам з былымі калегамі з БДУ навучае школьнікаў рыхтавацца да алімпіяд, а таксама сам складае алімпіядныя задачы па фізіцы.

**"ЗДАРОЎЕ НЕ КУПІШ!"** — пад такой назвай змешчана ў газеце "Звязда" (03.02.06) інфармацыя пра "Дні здароўя" ў БДУ.

**"ИННОВАЦИИ ОТ БГУ ОЖИДАЮТ В МОСКВЕ"** — так анансуе газета "Рэспубліка" (04.02.06) удзел нашага універсітэта ў VI Маскоўскім міжнародным салоне інавацый і інвестыцый.

Пра падзеі ў БДУ інфармавалі таксама рэспубліканскія агенцтвы "БЕЛТА", "ИНТЕРФАКС", "БелаПАН".

**Агляд падрыхтаваны прэс-службай БДУ**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## ШАМЯКІНСКІЯ ЧЫТАННІ

***31 студзеня на філалагічным факультэце БДУ 85-годдзе народнага пісьменніка Беларусі Івана Пятровіча Шамякіна было адзначана спецыяльнымі чытаннямі, якія арганізавала кафедра беларускай літаратуры і культуры.***

На іх выступілі доктары філалагічных навук Алесь Бельскі і Міхась Тычына, кандыдаты філалагічных навук Уладзімір Навумовіч і Анатоль Верабей, якія гаварылі пра творчасць пісьменніка, яе адметнасць. А потым успамінамі пра Івана Шамякіна падзяліліся галоўны рэдактар часопіса "Полымя" Мікола Мятліцкі, дацэнт Вольга Казлова, выкладчыца Людміла Карпава. Завяршыліся чытанні выступленнем дачкі пісьменніка, доктара філалагічных навук Таццяны Шамякінай, якая таксама нагадала некаторыя цікавыя эпізоды з жыцця Івана Пятровіча.

Іван Шамякін быў частым госцем на філфаку, выкладчыкі і студэнты не раз слухалі яго выступленні, маглі папытаць пра ўсё, што іх цікавіла. Ужо ў апошнія гады жыцця, калі Іван Пятровіч не мог па стане здароўя прыйсці да філолагаў, ён згадзіўся адказаць на загадзя падрыхтаваныя пытанні. Гутарка з ім была запісана на відэастужку, якая паказвалася і паказваецца студэнтам. Гэта быў апошні прыжыццёвы відэазапіс-інтэрв'ю І.Шамякіна. А галоўная даніна памяці пісьменніку — знаёмства з яго творамі — адбываецца ў сценах філфака пастаянна.

**Міхась КЕНЬКА**

## АБ'ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крыміналістыкі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: радыёфізікі, малекулярнай біялогіі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, вышэйшай матэматыкі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, матэматычнай фізікі, метадаў аптымальнага кіравання, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, экалагічнага і аграрнага права, паліталогіі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: радыёфізікі, фізікі, інфарматыкі, фізіялогіі чалавека і жывёл;

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ крыміналістыкі;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: лікавых метадаў і праграміравання, інфарматыкі, матэматычнага забеспячэння ЭВМ.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

### Нацыянальны навукова-навучальны цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій БДУ (НЦ ФЧВЭ БДУ)

**абвяшчае конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

вядучага навуковага супрацоўніка ў лабараторыю фундаментальных узаемадзеянняў (2 чал.);

галоўнага навуковага супрацоўніка ў лабараторыю квантавай тэорыі поля (1 чал.).

**Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220040, г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 153, пакой 302, тэл. 292-60-34, аддзел кадраў.**

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*И.И. Пирожник.* **Проблемы политической географии.** У курсе лекцый сістэмна выкладаюцца тры ўзаемазвязаныя геаграфічныя дысцыпліны: палітычная геаграфія, геапалітыка і геаканфлікталогія. Аналізуецца палітыка-геаграфічная структура макрарэгіёнаў свету, раскрываюцца прычыны і генезіс сучасных рэгіянальных і сепаратысцкіх канфліктаў.

**Экономико-математические расчеты в системе Mathematica.** *Авторы-составители И.В. Большакова, В.С. Мастяница.* У навучальным дапаможніку для студэнтаў эканамічнага факультэта разглядаюцца пытанні прымянення універсальнай сістэмы Mathematica у якасці лічбавага, сімвальнага і графічнага калькулятара. Выкладаюцца асновы праграміравання.

*А.А. Звозников.* **Ведение деловых переговоров.** У курсе лекцый бізнес-перагаворы разглядаюцца як мастацтва маўленчых зносін і паводзін, як сістэма моўна-дзейных прыёмаў, накіраваных на эфектыўнае ўздзеянне, перакананне і збліжэнне інтарэсаў дагаворных бакоў.

*А.Н. Денисов, В.М. Хобта.* **Тактика мотострелкового отделения.** У навучальным дапаможніку выкладаюцца асноўныя палажэнні падрыхтоўкі і вядзення агульнавайсковага бою, апісваецца арганізацыя бою мотастралковага аддзялення.

**Современные концепции и инструментарий международного менеджмента.** У зборніку навуковых артыкулаў разглядаюцца актуальныя напрамкі развіцця сучаснага міжнароднага бізнесу.

*А.В. Сидоренко, Ю.В. Сидоренко, Т.П. Янукович.* **Физика.** У практыкуме пададзены лабараторныя работы, асноўная ўвага ў якіх надаецца эксперыментальнаму вывучэнню з'яў у розных галінах фізікі: механіцы, малекулярнай фізіцы, электрычнасці і магнетызме, оптыцы, атамнай фізіцы.

**Белорусский государственный университет: Программы перспективного развития.** У зборнік увайшлі праграмы перспектыўнага развіцця БДУ, распрацаваныя для выканання пастановы Вучонага савета БДУ "Стан і перспектывы развіцця навучальна-выхаваўчага працэсу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце" ад 24 чэрвеня 2004 г.

**Компьютерное проектирование цифровых систем.** *Авторы-составители И.П. Стецко, В.Д. Кулик.* Практыкум разглядае пытанні праектавання лічбавых сістэм на аснове праграмаваных лагічных інтэгральных схем фірмы ALTERA з дапамогай пакета MAX+PLUS II.

**Государственное (конституционное) право зарубежных стран.** *Авторы-составители Н.М. Кондратович, Л.А. Приходько.* Навучальна-метадычны дапаможнік прапануе матэрыялы, неабходныя для вывучэння дзяржаўнага (канстытуцыйнага) права замежных краін.

**Гістарычны факультэт. Да 70-годдзя заснавання.** У юбілейным выданні змяшчаюцца інфармацыйныя матэрыялы, у якіх раскрываецца станаўленне гістарычнага факультэта БДУ, даюцца падрабязныя звесткі пра сучасныя кафедры, прадстаўлена творчасць літаратурнага аб'яднання факультэта, прыводзіцца спіс выпускнікоў дзённай формы навучання за 1944—2003 гг.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ТЭАТРАЛЬНЫЯ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ ЛІЦЭІСТАЎ

***Маразы і сесія не здолелі перашкодзіць працы Тэатральнай студыі ліцэя БДУ. 24 студзеня ў актавай зале ліцэя адбылася прэм'ера спектакля "Стары сеньёр з велізарнымі крыламі".***

П'еса была створана Андрэем Курэйчыкам па матывах апавядання Габрыэля Гарсіа Маркеса. Вядомы драматург выступіў таксама ў якасці рэжысёра і педагога.

Тэатральная студыя існуе ў ліцэі ўжо паўтара года. З 70 жадаючых патрапіць у творчую майстэрню было абрана 15 чалавек. А. Курэйчык падчас працы з ліцэістамі выкладаў на Рэжысёрскім факультэце Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва. Выкарыстоўваючы вопыт і тэхналогіі найлепшых расійскіх тэатральных педагогаў, былы ліцэіст дапамагае маладым людзям развіваць свае тэатральныя здольнасці, даведвацца пра найноўшыя тэндэнцыі сусветнага тэатра. За час існавання творчай лабараторыі былі пастаўлены п'есы Астроўскага, Шэкспіра, Горына.

А. Курэйчык адзначае працаздольнасць сваіх падапечных, якія прыходзілі на рэпетыцыі па нядзелях і нават тады, калі заняткі былі адменены з-за маразоў. Ліцэісты самі прыдумалі касцюмы і сцэнічнае аздабленне для спектакля, здолелі заглыбіцца ў філасофію п'есы. На думку Курэйчыка, менавіта маладыя людзі з іх шчырасцю, энтузіязмам і цікаўнасцю зараз найбольш гатовыя да сапраўднага творчага пошуку.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Аляксея ШЛЫКА**



## СВЯТЫ

# ДЗЕНЬ СВЯТОГА САВЫ ПА-БЕЛАРУСКУ

Нацыянальнае свята сербскага народа — Дзень святога Савы — адсвяткавалі студэнты сербскага аддзялення філфака БДУ.

Святы Сава — апякун і першаасветнік Сербіі. Для сербскай дзяржавы шанаванне Савы можна параўнаць з шанаваннем Еўфрасінні Полацкай у нашай краіне.

27 студзеня ў Доме дружбы студэнты філфака арганізавалі вечар, насычаны цікавымі сюрпрызамі і сустрэчамі. Гасцямі яго сталі прадстаўнікі пасольства Сербіі і Чарнагорыі і Таварыства сербска-беларускай дружбы. Ім была паказана багатая праграма, сцэнарый для якой напісала выкладчыца сербскай мовы філфака, кандыдат філалагічных навук Святлана Галяк.

Перад гасцямі выступіў хор "Голас душы" пад кіраўніцтвам Таццяны Гажэўскай. Беларускія студэнты-сербісты чыталі вершы і спявалі песні па-сербску, па-руску і па-беларуску, пераклад якіх яны зрабілі самі. Таксама студэнты прадэманстравалі гумарыстычную пастаноўку па матывах аповесці Браніслава Пушыча. А актрысы тэатра-студыі кінаакцёра Святлана Сухавей, Алла Пролiч і Вера Палякова падаравалі гасцям цудоўныя беларускія народныя песні. На працягу вечара прагучала шмат цёплых слоў пра сяброўства паміж беларускім і сербскім народамі.

**Настасся ЮДЧЫЦ**

## З УСМЕШКАЙ



Прафесар студэнту-лінгвісту, які "завальвае" чарговы залік:

— Ладна, так і быць, пастаўлю вам залік, калі скажаце: якія тры словы найчасцей ужываюць студэнты.

— Я не ведаю.

— Абсалютна правільна! Давайце вашу залікоўку.

***

Студэнт на экзамен у кансерваторыю прыйшоў з мяшкамі пад вачыма, пакамечаны і не ў гуморы. Выкладчык пытаецца:

— Што такое? Што здарылася?

— Усю ноч каты гарлалі пад акном, не давалі заснуць.

— А як гарлалі?

— Ды так... папсу розную...

***

У інстытуце на лекцыі па эканоміцы выкладчык заяўляе:

— І калі я ўначы пабуджу вас і спытаюся: "Што такое мікраэканоміка?" — вы будзеце абавязаны мне правільна адказаць!

— А чаму гэта ВЫ павінны пабудзіць мяне ЎНАЧЫ?

**Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ**

## АБ'ЯВЫ

# ЛІЦЭЙ БДУ ЗАПРАШАЕ

**Ліцэй БДУ абвяшчае прыём навучэнцаў у 10-я класы наступных профіляў: матэматычны (60 месцаў), фізічны (40 месцаў), хімічны (20 месцаў), біялагічны (40 месцаў), філалагічны (40 месцаў), гістарычны (40 месцаў).**

Прыём у ліцэй БДУ адбываецца на конкурснай аснове па выніках адкрытых Рэспубліканскіх прадметных алімпіяд "Абітурыент ліцэя БДУ — 2006", якія праводзяцца 30 красавіка і 7 мая 2006 года (**пісьмова**) па наступных прадметах:

**30 красавіка, першая алімпіяда:**

профіль навучання **фізіка** — алімпіяда па **фізіцы**;

профіль навучання **матэматыка** — алімпіяда па **матэматыцы**;

профіль навучання **хімія** — алімпіяда па **хіміі**;

профіль навучання **біялогія** — алімпіяда па **хіміі**;

профіль навучання **філалогія** — алімпіяда па **рускай мове і літаратуры**;

профіль навучання **гісторыя** — алімпіяда па **сусветнай гісторыі (найноўшы час)**.

**7 мая, другая алімпіяда:**

профіль навучання **фізіка** — алімпіяда па **матэматыцы**;

профіль навучання **матэматыка** — алімпіяда па **фізіцы**;

профіль навучання **хімія** — алімпіяда па **матэматыцы**;

профіль навучання **біялогія** — алімпіяда па **біялогіі**;

профіль навучання **філалогія** — алімпіяда па **беларускай мове і літаратуры**;

профіль навучання **гісторыя** — алімпіяда па **гісторыі Беларусі**.

Права паступлення ў ліцэй БДУ маюць навучэнцы, якія жывуць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і атрымалі ў бягучым годзе агульную базавую адукацыю. Навучанне ў ліцэі БДУ ажыццяўляецца на бюджэтнай аснове.

**Па-за конкурсам залічваюцца:**

на адпаведны профіль навучання — пераможцы заключнага этапа Рэспубліканскай алімпіяды (дыпломы I, II, III ступеняў), якая ладзіцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у бягучым навучальным годзе;

у клас матэматычнага профілю — пераможцы заключнага этапа Рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы (дыпломы I і II ступеняў).

Навучэнцы, якія паступаюць у ліцэй БДУ, падаюць наступныя дакументы: **даведку з фатаграфіяй, завераную пячаткай установы адукацыі**, заяву на імя дырэктара ліцэя БДУ вызначанага ўзору, квітанцыю аб аплаце арганізацыйнага ўзносу. Пераможцы заключнага этапа Рэспубліканскай алімпіяды бягучага года падаюць **копіі дыпломаў**.

Дакументы прымаюцца **з 20 сакавіка па 25 красавіка 2006 г. уключна**.

На час конкурснага адбору інтэрнат іншагароднім навучэнцам не прадастаўляецца.

**Цалкам правілы прыёму размяшчаюцца на сайце ліцэя БДУ (www.lyceum.bsu.by).**

**Тэлефоны для даведак: 209-56-19, 209-56-14, 209-56-11, 209-56-02.**

**Адрас: г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8.**

# НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

Студэнт III курса гістарычнага факультэта Уладзімір Бандарэнка, старшыня студсавета інтэрната №1, абраны старшынёй Каардынацыйнага савета студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ.

Семінар-практыкум для педагагічных работнікаў студгарадка "Прафілактыка правапарушэнняў і залежнасцяў у студэнцкім асяроддзі" адбудзецца 15 лютага ў канферэнц-зале інтэрната № 2. Пачатак мерапрыемства ў 15 гадзін.

**Паводле інфармацыі грамадскай інфармацыйнай службы студгарадка БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

9 лютага 2006 года
Падпісана да друку 08.02.2006 г.
Зак. 108. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра Саламахіна
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7,
пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by